УДК 7.036(476):7.071.4:378.4

# Лёс творцы: у сугуччы душэўнасці і шчырасці: да 80-годдзя з дня нараджэння мастака, навукоўцы і педагога Вячаслава Шамшура

***Цыбульскі М.Л.***
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск*

*Артыкул прысвечаны аналізу жыцця і творчасці вядомага беларускага мастака, навукоўцы і педагога Вячаслава Шамшура. Ураджэнец Мёрскага краю В. Шамшур скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава, аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар. З 1970 г. выкладае ў Віцебскім дзяржаўным педагагічным інстытуце (зараз ВДУ імя П.М. Машэрава), загадчык кафедры мастацтваў (1986–2005), прафесар кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (з 2005). Сябра Беларускага саюза мастакоў.*

*Асноўныя творчыя работы выкананыя ў тэхніцы лінагравюры і пастэлі. Рэалістычнае бачанне натуры і пэўная сюжэтная аснова – ключавыя ў творчасці В. Шамшура. Працуючы над лінарытамі, ён здолеў надаць гэтай па сутнасці плакатнай тэхніцы паэтычны характар. З пачатку 1990-х гадоў В. Шамшур працуе пераважна ў тэхніцы пастэлі, якая ў яго творчасці набыла новае гучанне, жывапісную дэкаратыўнасць і падкрэсленую дынаміку.*

*Мастака асабліва прыцягваюць і захапляюць пейзажныя матывы, адлюстраванне прыроды. Значная колькасць твораў Вячаслава Шамшура прысвечана Мёршчыне і Браслаўшчыне. У творчасці мастака можна казаць пра асаблівую паэтыку гарадскога пейзажу. Творца неаднойчы звяртаўся да адлюстравання гарадскіх пейзажаў з выявамі вядомых віцебскіх храмаў, да стварэння кампазіцый, у якіх імкнуўся перадаць своеасаблівую прыгажосць дваркоў паўночнай сталіцы Беларусі.*

***Ключавыя словы:*** *беларускае мастацтва XX стагоддзя, віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут, мастацка-графічны факультэт, беларускае мастацтвазнаўства, графіка, лінарыт, пастэль.*

*(Искусство и культура. – 2022. – № 4(48). – С. 5–9)*

# The Fate of the Creator: in Harmony of Heartfeltness and Sincerity: to the 80th Birthday of the Artist, Scholar and Teacher Vyacheslav Shamshur

***Tsybulski M.L.***
*Education Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk*

*The article is concerned with the analysis of the life and work of the famous Belarusian artist, scientist and teacher Vyacheslav Shamshur. V. Shamshur, a native of the Miorsky region, graduated from the Art Faculty of Vitebsk StateS.M. Kirov Pedagogical Institute, did postgraduate studies at the Institute of Art Studies, Ethnography and Folklore of the Academy of Sciences of the BSSR. He is PhD (Art), Professor. Since 1970, he has been teaching at Vitebsk State P.M. Masherov Pedagogical Institute (now P.M. Masherov VSU), Head of the Department of Arts (1986–2005), Professor of the Department of Decorative and Applied Arts (since 2005). Member of the Belarusian Union of Artists.*

*The main works are created in the technique of linocut and pastel. A realistic vision of nature and a certain plot basis are the key in the work of V. Shamshur. Working on linocuts, he managed to give this essentially poster technique a poetic character. Since the beginning of the 1990s, V. Shamshur has been working mainly in the pastel technique, which in his work has acquired a new sound, painterly decorativeness and emphasized dynamics.*

*The artist is especially attracted and fascinated by landscape motifs, depiction of nature. A significant number of Vyachaslav Shamshur’s works are dedicated to Miorshchyna and Braslavshchyna. In the artist's work, one can speak of a special poetics of the urban landscape. Shamshur more than once turned to the depiction of urban landscapes with images of famous Vitsebsk temples, to the creation of compositions in which he tried to convey the peculiar beauty of Vitsebsk courtyards.*

***Key words:*** *Belarusian art of the 20th century, Vitebsk State Pedagogical Institute, Art Faculty, Belarusian art history, graphics, linocut art, pastel.*

*(Art and Cultur. – 2022. – № 4(48). – P. 5–9)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

Жыццё і творчасць мастака яднае адзіная храналогія падзей. У гэтых складаных узаемадачыненнях і канатацыях фарміруецца яго індывідуальнасць, паўстае тое, што называецца ЛЁСАМ ТВОРЦЫ. Вобразны свет звычайна даволі шматгранна раскрывае ўнутраны свет іх аўтара, яго характар, каштоўнасныя арыенціры і да таго ж эмацыянальна і псіхалагічна "афарбоўвае" біяграфію мастака. У кантэксце дадзеных разважанняў асоба вядомага беларускага мастака, навукоўцы і педагога, прафесара Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава Вячаслава Шамшура [1, с. 598] падаецца цудоўным узорам для даследавання яго жыццёвага, навуковага і творчага шляху.

Мэта артыкула – прааналізаваць этапы жыцця і творчасці Вячаслава Шамшура, вобразны свет і стылістычныя асаблівасці яго мастацкіх твораў.

**Мая Радзіма – Мёршчына.** Вячаслаў Шамшур нарадзіўся 20 жніўня 1942 года ў в. Пціцкія Мёрскага раёна Віцебскай вобласці. Яго бацька быў палякам, а маці – беларускай. Яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі бацькі некаторы час жылі ў Пецярбургу, а ў міжваенны час вярнуліся на Беларусь.

"Калі ў 1941 годзе пачалася вайна, майго бацьку і ўсіх дарослых палякаў з вёскі забралі і выслалі ў Сібір. Я быў занадта малы, і таму пра гэтыя падзеі мне пазней апавядала маці. Я не ведаў, у чым абвінавачвалі бацьку і ўсіх астатніх... Бацька адсядзеў каля года ў лагеры, а з лагера быў мабілізаваны па пагадненні з савецкім кіраўніцтвам у Войска Польскае. Потым служыў у разведцы ў складзе дывізіі імя Т. Касцюшкі. Дайшоў аж да Берліна і закончыў вайну ў званні лейтэнанта. Быў узнагароджаны залатым крыжам Virtuti Militari.

Пасля вайны высокія польскія афіцэры раілі бацьку не вяртацца ў СССР, бо, на іх думку, ён зноў мог трапіць у лагер. І ён застаўся ў Польшчы. Там бацька атрымаў хутар у Судзетах. Пісаў нам з маці, каб мы ехалі да яго. Даслаў нават запрашэнне. Але звычайны чалавечы страх перад невядомым і цяжкасці з афармленнем усіх неабходных дакументаў не дазволілі нам здзейсніць гэта. У выніку мы засталіся ў Беларусі. І хаця мой бацька, і мая маці пазней стварылі новыя сем'і, адносіны паміж імі заставаліся вельмі добрымі. Ужо ў дарослым узросце я часта ездзіў да бацькі, сустракаўся з яго сынамі ад другога шлюбу, але ні ў маці, ні ў мяне не было на яго крыўды. Бо не па нашай віне, а праз гэтае вялікае няшчасце, якім з'яўляецца вайна, мы раз'ядналіся..." [1]

Пасляваеннае дзяцінства В. Шамшура прайшло сярод цудоўнай прыроды Мёрскага краю. "Бацькі майго бацькі Шамшуры жылі ў Пціцкіх непадалёк ад Мацюкоўскага возера, а бацькі маці – Сушкі на хутары ў Масеўцах на беразе маленькай, але шустрай рачулкі Гавеніцы, што цячэ ў возера Трубянец. За рэчкай быў вялізны бярозавы гай…" [2, с. 154–156].

Маляваць Вячаслаў Шамшур пачаў з дзяцінства, а ў час навучання ў Мёрскай СШ у гэтым яго падтрымаў класны кіраўнік Пётр Нікіфаравіч Салоха. Пазней юны талент вучыўся мастацтву ў гуртку пад кіраўніцтвам завуча школы А. Капітанава. Па матэрыяльных абставінах В. Шамшур быў вымушаны працягваць вучобу ў Мёрскай сярэдняй вячэрняй школе працоўнай моладзі, якую скончыў у 1962 годзе.

**На віцебскім мастацка-графічным.** У 1962 годзе Вячаслаў Шамшур паспяхова здае ўступныя экзамены на мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута. Але паводле тагачасных законаў яго, ужо студэнта, прызываюць на службу ў войска. Вярнуўся ў інстытут ён толькі ў 1965 годзе. Таму ў дыпломе В. Шамшура напісана: вучыўся ў 1962–1970 гг.

Калі будучы навуковец толькі паступіў на мастацка-графічны факультэт, малюнак у яго групе пачаў весці вядомы графік Р. Клікушын, а жывапіс і кампазіцыю – загадчык кафедры малюнка і жывапісу В. Дзежыц. "Пасля вяртання з войска ізноў на першы курс Дзежыца ў жывых я ўжо не застаў. Загадчыкам кафедры стаў Р. Клікушын (...). Ён працягваў весці малюнак і новую дысцыпліну, якая па навучальным плане звалася «Школьная дэкаратыўна-афарміцельская справа». Можа быць з-за навізны, разнастайнасці тэм і заданняў прыкладнога характару і, вядома, прафесіяналізму выкладчыка гэтая дысцыпліна больш за ўсё запомнілася (...) І, зразумела, як спецыяліст Г. Клікушын шмат часу і ўвагі надаваў шрыфтавой графіцы, пры гэтым часта наглядна дэманструючы сваё высокае майстэрства" [3, с. 5–8].

Прыкметна, што графікі як навучальнай дысцыпліны ў той час у вучэбным плане не існавала. Тым не менш на кафедры быў афортны станок, на якім друкаваліся лінагравюры, гравюры на кардоне і інш. "Многія выпускнікі тых гадоў з падзякай успамінаюць гурток графікі, які вёў Рыгор Філіповіч. Пад яго кіраўніцтвам мы выконвалі творчыя працы ў розных тыражных тэхніках: каляровыя эстампы з выкарыстаннем прамасленых масак з паперы, гравюры на кардоне, фанеры, лінолеуме. На лінолеуме рэзалі шчаслівчыкі, якія здолелі самастойна зрабіць разцы ці «дастаць» іх. Практыкаваліся справаздачныя

[1]Запіс інтэрв'ю з В. Шамшурам у жніўні 2022 г.

гуртковыя выставы эстампаў з наступным іх абмеркаваннем” [3, с. 5–8].

“Калі казаць пра методыку выкладання спецдысцыплін, то яна не вылучалася нейкімі асаблівасцямі. У аснове ляжала акадэмічная сістэма мастацкай адукацыі, часткова адаптаваная да праграм педагагічнага інстытута. Педагогі ў нас былі выдатныя. Акрамя Р. Клікушына акварэль і жывапіс у мяне выкладалі І. Сталяроў і А. Гаўрушка”[2]. “Да таго ж на кожнага з нас уплывала і асяроддзе, творчая атмасфера, якая існавала на факультэце, – узгадвае аднакурснік Шамшура Віктар Данілаў. – Мы вучыліся адзін у аднаго. Наш курс вылучаўся на факультэце сярод іншых. На ім вучыліся тыя, хто пазней стане вядомымі мастакамі. Сярод іх Уладзімір Напрэенка, Яўген Панамарэнка, Аляксандр Дасужаў, Міхаіл Глушко, Мікалай Шышлоў, Антон Ясюкайць, Юрый Чарняк, Мікалай Гугнін, Мікалай Таранда... Мы любілі на праглядах знаёміцца з работамі сваіх аднакурснікаў. Таму і запомнілася, што ў Шамшура быў даволі «моцны» малюнак. А яшчэ ён ужо ў той час спрабаваў займацца навукай і нават нейкую прэмію атрымаў за распрацоўку, звязаную з праграмаваннем. Пасля заканчэння інстытута В. Шамшура пакінулі працаваць выкладчыкам на кафедры малюнка і жывапісу”[3].

**Шлях у навуку.** Праз пяць год В. Шамшур паступае ў аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, дзе пад кіраўніцтвам доктара мастацтвазнаўства Л. Дробава працуе над дысертацыяй на тэму “Мастацкае афармленне савецкіх масавых свят у Беларусі (1918–1941 гг.)”. “На Беларусі, – прыгадвае В. Шамшур, – я адным з першых у сваёй кандыдацкай дысертацыі звярнуўся да даследавання творчасці Казіміра Малевіча ў Віцебску і мастакоў яго кола. У канцы 1970-х гэта было зусім не простай справай...” У час навучання ў аспірантуры (1975–1978) В. Шамшур не пакідае і заняткаў графікай, наведвае ў Мінску вячэрнюю мастацкую студыю заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Я. Красоўскага [2, с. 154–156].

Пасля заканчэння аспірантуры ў 1978 годзе В. Шамшур вяртаецца ў Віцебскі педагагічны інстытут, дзе пэўны час працуе старшым выкладчыкам кафедры мастацкага канструявання і методыкі працоўнага навучання. А ўжо ў 1980 годзе ў Маскве ва Усесаюзным навукова-даследчым інстытуце мастацтвазнаўства пры Міністэрстве культуры СССР абараняе дысертацыю і яму прысвойваецца вучоная ступень кандыдата мастацтвазнаўства. У 1984 годзе ВАК СССР прысвойвае В. Шамшуру вучонае званне дацэнта.

На мастацка-графічным факультэце ў гэты час ён выкладае мастацтва плаката, афармленне інтэр’ера, шрыфтавыя работы і распрацоўвае адпаведнае метадычнае забеспячэнне для дадзеных прадметаў [4].

**Кафедра мастацтваў і творчасць.** У 1986 годзе Вячаслава Шамшура прызначаюць на пасаду загадчыка кафедры методыкі выкладання выяўленчага мастацтва (яна з 2001 года стане называцца кафедрай мастацтваў ВДУ) Віцебскага педінстытута. Гэта перыяд асабліва актыўнай не толькі педагагічнай, але навуковай і творчай дзейнасці В. Шамшура.

У 1989 годзе выходзіць з друку яго манаграфія “Празднества революции”, прысвечаная гісторыі мастацкага афармлення паслярэвалюцыйнага Віцебска і іншых гарадоў Беларусі [5], ён становіцца суаўтарам 4-га тома “Гісторыі мастацтва Беларусі” (1989–1991), выступае з артыкуламі ў навуковых часопісах і перыядычным друку. Плённая навуковая і творчая дзейнасць з’яўляецца падставай для прысваення В. Шамшуру ў 1993 годзе ВАКам вучонага звання прафесара.

У гэты перыяд Вячаслаў Шамшур прымае актыўны ўдзел ў мастацкіх выставах, таму ён ужо сябра Беларускага саюза мастакоў [6, с. 606]. Нягледзячы на тое, што на мастацкіх выставах кампазіцыі В. Шамшура з’явіліся ў сярэдзіне 1980-х, цікавасць да творчай працы ў яго, здаецца, існавала заўжды. Але ж, безумоўна, менавіта апошняя чвэрць стагоддзя стала тым часам, калі яго творчы патэнцыял раскрыўся найбольш поўна [7].

З велізарнай колькасці выстаў, у якіх прымаў актыўны ўдзел В.В. Шамшур, прыгадаем толькі найбольш значныя: міжнародныя – выстава мастакоў Віцебска ў г. Каўнасе (Літва, 1988), мастацкія выставы па выніках пленэру ў г. Горліцэ (Польша, 2000, 2002); рэспубліканскія – “У краі блакітных азёр” (Мінск–Браслаў, 1987), выстава мастакоў Віцебскай вобласці (Мінск, 1987), “Чалавек і экалогія” (Мінск, 1987), “100 год з дня нараджэння М. Багдановіча” (Мінск, 1991), “Мір і міласэрнасць” (Мінск, 1993), мастацкая выстава, прысвечаная 60-годдзю Беларускага саюза мастакоў (Мінск, 1998). Сярод мастацкіх выстаў, якія праходзілі ў Віцебску, – “Спадчына”, прысвечаная памяці М. Шагала (1991), “75 год Віцебскай мастацкай школе” (1994), “Шляхамі Вялікай Перамогі” (1995), “Чарнобыль-Х” (1996), “110 год з дня нараджэння М. Шагала” (1997), “60 год Віцебскай вобласці” (1998), “Памяці Ул. Караткевіча” (2000). Вячаслаў Шамшур удзельнічаў практычна ва ўсіх тэматычных

[2] Запіс інтэрв’ю з В. Шамшурам у жніўні 2022 г.
[3] З успамінаў В. Данілава. Запіс у верасні 2022 г.

выставачных праектах і юбілейных выставах мастакоў – выкладчыкаў універсітэта. Акрамя таго, у мастака велізарная колькасць персанальных выстаў.

Адно з любімых і пастаянных захапленняў В. Шамшура – праца на пленэры. Ён удзельнік вялікай колькасці пленэраў, сярод якіх міжнародны мастацкі пленэр “Усход–Захад” у г. Горліцэ (Польшча) (2000, 2002, 2004, 2011), рэспубліканскія пленэры, прысвечаныя У. Караткевічу (2005), Р. Барадуліну (2006), Н. Ордзе (2006), Я. Драздовічу (2007), В. Быкаву (2008, 2012, 2013, 2014), І. Хруцкаму (2008), Я. Баршчэўскаму (2009), Э. Плятэр (2010) і інш.

**Лінарыт.** Вячаслаў Шамшур пачынаў з лінарытаў і на працягу некалькіх год выдатна засвоіў гэтую тэхніку. Ужо ў ёй мастак прадэманстраваў свае лепшыя якасці графіка, сапраўднага майстра кампазіцыі. У лінарытах В. Шамшура 1980-х гадоў нельга не заўважыць уплыву лепшых традыцый віцебскай школы гравюры 20-х гадоў. Але пры гэтым Вячаслаў Шамшур надзвычай індывідуальны, ён заўжды імкнуўся быць самім сабой, абапіраючыся ў творчасці на ўласныя ўспаміны, думкі і пачуцці. Адна з першых персанальных выстаў мастака, якая прадставіла гледачу серыі яго лінарытаў, прайшла ў Зеленагурскай вышэйшай педагагічнай школе (Польша) яшчэ ў 1987 годзе.

У лінарытах, у межах, здавалася б, мінімалістычнага ўжывання выяўленчых сродкаў, мастаку ўдавалася падкрэслена жывапісная трактоўка прасторы, з дакладнай перадачай не толькі яе глыбіні і пластычных асаблівасцей, але і выразнага эмацыянальнага настрою. Пры гэтым В. Шамшур заўжды асабліва ўважліва адносіўся да магчымасцей тэхнікі і матэрыялу, у поўнай меры выкарыстоўваў мастацкую выразнасць штрыха, лініі, танальнай плямы. Накоплены ў гэтай галіне графікі велізарны вопыт ужо значна пазней знойдзе ўвасабленне ў вучэбна-метадычным дапаможніку Вячаслава Шамшура “Лінарыт. Мастацтва і тэхніка”, выдадзеным у 2000 годзе [8].

Рэалістычнае бачанне натуры і пэўная сюжэтная аснова з самага пачатку сталі той прызмай, праз якую мастак выяўляў свае адносіны да прыгажосці навакольнага свету. Працуючы над лінарытамі, Вячаслаў Шамшур здолеў надаць гэтай па сутнасці плакатнай тэхніцы паэтычны характар. Для сваіх кампазіцый ён абірае даволі спецыфічныя матывы, выкарыстоўвае нязвыклыя ракурсы, элементы стаффажу, якія “ажыўляюць” прастору краявіда, надаюць вобразнасці рысы апавядальнасці. Акрамя таго мастак спрабуе вырашаць у лінарыце не ўласцівыя для гэтай тэхнікі задачы: удала перадае штрыхом не толькі глыбіню прасторы, але нават стан паветра і фактуру аб’ектаў.

**Пастэль.** З пачатку 1990-х гадоў В. Шамшур больш увагі надае тэхніцы пастэлі, якая ў яго творчасці набыла новае гучанне, жывапісную дэкаратыўнасць і падкрэсленую дынаміку. Адмовіўшыся ад растушоўкі як ад асноўнага тэхнічнага прыёму, з дапамогай якога звычайна перадаваліся тонкія пераходы колеру і тону, В. Шамшур аддаў перавагу выразнаму штрыху як ключавому сродку эмацыянальнай выразнасці і дынамічнай экспрэсіўнасці пластычнай формы [9, с. 5].

У пошуках новых уражанняў і натхнення Вячаслаў Шамшур звычайна робіць замалёўкі і накіды з натуры, з якімі далей працуе ўжо ў майстэрні. З аднаго боку, мастак імкнецца да натуральнасці, “ненадуманасці кампазіцыі”, а з другога – ніколі не займаецца прамым капіраваннем прыроднага матыву, шмат увагі надае яго кампазіцыйнай завершанасці і мастацка-вобразнай цэласнасці. Кожная дэталь у творы ўдала “працуе” на агульны сюжэт.

Адметная рыса большасці кампазіцый В. Шамшура – іх шматпланавасць. Нярэдка мастак піша амаль што панарамныя краявіды са складана танальна распрацаванымі планамі, з адлюстраваннем эмацыянальна выразнага, напружанага стану прыроды. Заўжды ў яго пастэлях выразна і цікава арганізаваны пярэдні план кампазіцыі, своеасаблівы ўваход у яе прастору і паэтычны свет. Да і ў назвах твораў Вячаслава Шамшура адчуваюцца пяшчотныя лірычныя інтанацыі. Эмацыянальная выразнасць, асаблівая ўзнёсласць, нейкая святочная ўрачыстасць у першую чаргу характарызуюць каларыстычны лад твораў мастака [10, с. 6–10]. Вялікі практычны вопыт, напрацаваны В. Шамшурам у галіне пастэлі, стане падставай для напісання грунтоўнага вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў [11].

**Пейзаж – крыніца натхнення.** Вячаслава Шамшура нярэдка называюць класікам пейзажнага жанру, і ў гэтым няма вялікага перабольшвання. Яго творы ў поўнай меры адлюстроўваюць сучасныя ўяўленні пра пейзаж, што сфарміраваліся за час існавання гэтага жанру і асабліва ў XX стагоддзі. Мастака моцна прыцягваюць і захапляюць пейзажныя матывы і родная прырода. У гэтай рэальнай навакольнай прасторы і адпавядаючай ёй вобразна-мастацкай прасторы ён адчувае сябе даволі вольна. Пейзажы В. Шамшура – гэта своеасаблівыя паэтычныя апавяданні аб сучаснасці і гістарычным лёсе роднага яму краю.

Значная колькасць твораў Вячаслава Шамшура прысвечана Мёршчыне, краю, дзе ён нарадзіўся і вырас, дзе мастак вельмі любіць

выстаўляць свае працы. Тэматычна роднаснай з'яўляецца і серыя твораў, прысвечаных азёрнаму краю Беларусі – Браслаўшчыне. І таму не дзіўна, што менавіта адметная прыгажосць воднага "люстэрка" даволі часта становіцца лейтматывам у пейзажах мастака. Амаль сімвалічна выглядае ў шэрагу твораў Вячаслава Шамшура дарога, якая вядзе некуды ўдалячынь. Гэты мастацкі прыём, як і выявы вясковых хатак, лазняў, матываў вясковага побыту, з'яўляюцца асабліва ўлюблёнымі для творцы, надаюць сюжэтную апавядальнасць яго карцінам, нярэдка ператвараюцца ў іх вобразныя дамінанты.

У творчасці В. Шамшура можна казаць пра адметную паэтыку гарадскога пейзажу. І гэта не толькі краявіды Віцебска, хоць менавіта ён дамінуе ў яго апошніх пейзажных кампазіцыях. Горад у мастака своеасаблівы, тут няма шуму, мітусні, неспакойных сучасных рытмаў, тут часцей пануюць мерны рух часу, даволі правінцыйны дух і нейкая надзвычай паэтычная мелодыя гарадскога матыву. Неаднойчы мастак звяртаўся да адлюстравання гарадскіх пейзажаў з выявамі вядомых віцебскіх храмаў, да стварэння кампазіцый, у якіх імкнуўся перадаць непаўторную прыгажосць дваркоў паўночнай сталіцы Беларусі.

Кожны новы твор Вячаслава Шамшура – гэта часцей за ўсё пошукі новага кампазіцыйнага прыёму і каларыстычнай інтанацыі, гармоніі іх суадносін. Пэўную ўвагу ў сваіх творах мастак надае адлюстраванню пачуццяў, эмацыянальнага стану, настрою.

Шчырасць у творчасці Вячаслава Шамшура – гэта ў першую чаргу адкрытасць яго асобы і пачуццяў. Гэта сардэчнасць і душэўнасць, даступнасць і зразумеласць у створаных ім вобразах. Шчырасць праяўляецца таксама ў выразнай нацыянальнай адметнасці твораў В. Шамшура, у яго вернасці пэўным ідэалам у мастацтве, адсутнасці баязлівасці непаразумення з боку "найсучаснейшага авангарда" [12, с. 38–39].

**Заключэнне.** Педагагічная, навуковая і творчая праца Вячаслава Шамшура ў розны час была адзначана дзяржавай, кіраўніцтвам Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускім саюзам мастакоў. Мастак узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства асветы БССР (1982), яму прысвоена званне "Выдатнік народнай асветы БССР" (1983), уручаны нагрудны знак ВДУ імя П.М. Машэрава "За адзнаку" (2021). За вялікі ўклад у развіццё мастацкай культуры і шматгадовую педагагічную дзейнасць В. Шамшур узнагароджаны і Ганаровай граматай Беларускага саюза мастакоў (1998). Не менш пачэсным для мастака стаў і спецыяльны прыз Полацка-Віцебскай епархіі, якім ён быў адзначаны на выставе-конкурсе віцебскіх мастакоў за лепшы мастацкі твор, прысвечаны духоўнаму адраджэнню асобы (1992).

**ЛІТАРАТУРА**


1. Цыбульский, М.Л. Шамшур Вячеслав Вячеславович / М.Л. Цыбульский // Регионы Беларуси: энцикл.: в 7 т. / редкол.: Т.В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2: Витебская область. Кн. 2. – С. 598.
2. Цыбульскі, М.Л. Імя ў навуцы і ў мастацтве: [да 60-годдзя з дня нарodзінаў прафесара і мастака Вячаслава Шамшура] / М.Л. Цыбульскі // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та. – 2003. – № 1. – С. 154–156.
3. Шамшур, В.В. История худграфа. Художник и педагог Григорий Кликушин / В.В. Шамшур // Искусство и культура. – 2018. – № 1. – С. 5–8.
4. Шамшур, В.В. Шрифтовые работы: метод. указания / В.В. Шамшур. – Витебск, 1982.
5. Шамшур, В.В. Празднества революции: организация и оформление советских массовых торжеств в Белоруссии / В.В. Шамшур. – Минск: Наука и техника, 1989. – 156, [3] с.
6. Шамшур Вячаслаў Вячаслававіч // Беларускі саюз мастакоў: 1938–1998: энцыкл. даведнік / аўт.-склад. Б.А. Крэпак [і інш.]. – Мінск: ВТАА "Кавалер Паблішэрс", 1998. – С. 606. – На беларус. і англ. мовах.
7. Шамшур, В. Паазер'е ў мастацкіх вобразах / В. Шамшур. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2002. – 55 с.
8. Шамшур, В.В. Лінарыт: мастацтва і тэхніка: вучэб.-метад. дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукац. шк. з мастацкім ухілам / В.В. Шамшур. – Мінск: НМЦэнтр, 2000. – 112 с.
9. Цыбульскі, М. Аксамітавы "голас" пастэлі: [пра творчасць мастака, выкладчыка Вячаслава Шамшура] / М. Цыбульскі // Витьбичи. – 2003. – 27 марта. – С. 5.
10. Вячаслаў Шамшур. Класіка сучаснага пейзажа : каталог выставы / ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна", Аддзел літаратуры па мастацтве; склад. В.А. Дарафеева, М.Л. Цыбульскі. – Віцебск, 2014. – 111 с.
11. Шамшур, В.В. Вобразны свет пастэлі [Выяўленчы матэрыял]: вучэб.-метад. дапаможнік для студэнтаў / В.В. Шамшур. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2008. – 19 с.
12. Цыбульскі, М. Душэўнай шчырасці цяпло: [пра віцебскага мастака Вячаслава Шамшура] / М. Цыбульскі // Мастацтва. – 2003. – № 4. – С. 38–39.


*Паступіў у рэдакцыю 10.11.2022*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА



*В. Шамшур. Малюнак бацькавай хаты ў в. Пціцкія. 1955*



*Матчына хата ў в. Масеўцы*



*Сям'я Сушко. Канец 1940-х*



*В. Шамшур з мамай.<br>Канец 1940-х*



*В. Шамшур з бацькам. Польшча*



*В. Шамшур сярод выпускнікоў<br>Мёрскай сярэдняй школы рабочай моладзі*



*Радавы Іркуцка-Пінскай дывізіі<br>В. Шамшур*



*В. Шамшур працуе<br>над копіяй карціны<br>А. Лакціёнава<br>ў вайсковым клубе*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА



*В. Шамшур у майстэрні жывапісу*




*В. Шамшур на мастацка-графічным факультэце.*
*Практычныя заняткі па чарчэнні*



*В. Шамшур з аднагрупнікамі*
*на дэманстрацыі*



*Чэрвень. З аднакурснікамі*



*Студэнт В. Шамшур на пленэры.*
*Юр'ева горка*



*На замалёўках у парку*



*Зіма. З аднакурснікамі*



*В. Шамшур з рэктарам В.Н. Вінаградавым*
*і калегам з Вяліка-Тырнаўскага ўніверсітэта.*
*Балгарыя. 1982*



*В. Шамшур сярод выкладчыкаў мастацка-графічнага факультэта*
*на дэманстрацыі*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА



*В. Шамшур сярод аднакурснікаў. Сустрэча выпускнікоў 1970 года*



*Майстар-клас*



*В. Шамшур з аднакурснікамі і калегамі*



*Адкрыццё выставы ў касцёле Св. Барбары.*
*Выступае вядомы мастак і педагог Р. Клікушын. 2003*



*В. Шамшур з дачкой на выставе. 2003*



*Віншаванне ад А. Жукавай*
*на персанальнай выставе В. Шамшура. 2012*



*В. Шамшур на выставе*
*ў Віцебскай абласной бібліятэцы. 2022*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА



*В. Шамшур на пленэры. Польшча*



*В. Шамшур сярод удзельнікаў пленэру У. Караткевіча. 2005*



*В. Шамшур каля помніка У. Караткевіча ў г. Оршы*



*В. Шамшур сярод удзельнікаў пленэру імя Я. Драздовіча*



*В. Шамшур на пленэры У. Караткевіча ў г. Оршы. 2017*



*В. Шамшур на міжнародным пленэры ў Польшчы*




*В. Шамшур сярод удзельнікаў міжнароднага пленэру ў зале пасяджэнняў магістрата г. Горліцы, Польшча*



*Міжнародны пленэр. У майстэрні. Польшча*



*В. Шамшур з дачкой сярод удзельнікаў пленэру. 2005. Польшча*



*Падрыхтоўка экспазіцыі ў г. Горліцы, Польшча*

## ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА



*В. Шамшур. Пейзаж з лазняй у Лучосе. Лінарыт. 1990*



*В. Шамшур. Мой азёрны край. Лінарыт. 1988*



*В. Шамшур. Фэст у Чэрасах. Лінарыт. 1990*



*В. Шамшур. Лясны ветэран. Лінарыт. 1988*



*В. Шамшур. Апошні аўтобус. Лінарыт. 1987*



*В. Шамшур. Забавы дзяцінства. Калаўрот. Лінарыт. 1987*



*В. Шамшур. Віцебскі дварок. Лінарыт. 1986*



*В. Шамшур. Чайкі. Лінарыт. 1988*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА



*В. Шамшур. Мёры. Пастэль. 2008*



*В. Шамшур. Хутар Альбіна. Серыя «Лазні». Кардон, пастэль. 2002*



*В. Шамшур. Глыбокае. Кардон, пастэль. 2007*



*В. Шамшур. Вечар у Бычках. Кардон, пастэль. 2007*



*В. Шамшур. Веліч мінулага (Белы Ковель). Кардон, пастэль. 2008*



*В. Шамшур. Ускраіна вёскі. Серыя «Лазні». Кардон, пастэль. 2011*



*В. Шамшур. Вяртанне. Серыя «Лазні». Кардон, пастэль. 2011*



*В. Шамшур. Лучоса. З серыі «Прыдзвінне». Кардон, пастэль. 2008*